УДК [94(476)+336.226.331(476)(091)]«18»

# СТАНАЎЛЕННЕ АКЦЫЗНАГА ПАДАТКААБКЛАДАННЯ ТЫТУНЮ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (40–50-Я ГГ. XIX СТ.)

***Аляксандр Ерашэвіч***
*Мінск, Беларусь*

Артыкул прысвечаны праблеме фарміравання сістэмы акцызнага падаткаабкладання тытунёвымі вырабамі на тэрыторыі Беларусі ў 40-50-я гады XIX ст. Аўтарам уведзены ў навуковы зварот новы фактычны матэрыял. Навуковая абгрунтаванасць асноўных высноў даследавання заснавана на выкарыстанні аўтарам як апублікаваных прававых актаў з Поўнага збору законаў Расійскай імперыі, так і неапублікаваных дакументаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску. Фіскальнае значэнне тытунёвага акцызу было мізэрным, паколькі тытунёвы збор збіраўся з нязначнай часткі ўсяго спажываемага насельніцтвам тытуню.

***Ключавыя словы: тытунь; тытунёвыя вырабы; акцызнае падаткаабкладанне; дзяржаўныя даходы; грашовыя зборы.***

У сістэме падаткаабкладання пэўную ролю іграюць акцызы на прадметы масавага спажывання (соль, цукар, спірт, тытунь). З ростам спажывання тытунёвых вырабаў фіскальныя інтарэсы казны патрабавалі ўвядзення тытунёвых збораў як адной з крыніцаў даходу дзяржавы. Дрэнная звычка спажывання курыльнага тытуню і нюхальнага табака з кожным годам павялічвала колькасць прыхільнікаў сярод прадстаўнікоў усіх станаў. У адным з лістоў ад 31.12.1853 г. літоўскі мітрапаліт І. Сямашка заўважыў, што нават некаторыя свяшчэнна і царкоўнаслужыцелі выдаткоўвалі на тытунь чвэрць і нават 1/3 частку свайго жалавання [23, с. 590].

Нягледзячы на бурны рост спажывання тытунёвых вырабаў (курыльны тытунь і нюхальны табака пераважна 3-га гатунку, сігары, з 1850 г. цыгаркі), да 1824 г. у Расійскай імперыі ніхто не ініцыіраваў праекта аб абкладанні тытуня акцызам з мэтай атрымання казённага даходу з тытунёвай прамысловасці і продажу тытунёвых вырабаў [1, с. 54]. Толькі ў канцы 30-х гг. XIX ст. дзякуючы намаганням міністра фінансаў Расійскай імперыі Я. Ф. Канкрына была створана своеасаблівая акцызная сістэма з манапольнымі правамі абкладання тытуню, прынцыпы якой не змяняваліся да 70-х гг. XIX ст. Аб’ектам акцызнага падаткаабкладання былі тытунёвыя вырабы, прызначаныя для дробнага продажу спажыўцу. Дзяржава захоўвала выключнае права нарміравання цэн тытунёвых вырабаў на тым узроўні, які ёй быў неабходны для мэт абкладання. Фіксіраваныя цэны спараджалі не неабмежаваную канкурэнцыю паміж тытунёвымі фабрыкантамі і гандлярамі адносна павелічэння цэн, а барацьбу за якасць тытунёвых вырабаў. Манапольнае права дзяржавы заключалася ва ўстанаўленні як розных відаў тытунёвых вырабаў і іх гатункаў, так і падрабязнай рэгламентацыі адносна іх фасоўкі.

Асноўныя палажэнні акцызна-бандэрольнай сістэмы спагнання грашовага збору з тытунёвых вырабаў былі замацаваны ў складзеным міністрам фінансаў, разгледжаным у Дзяржаўным Савеце, зацверджаным 31.03.1838 г. імператарам і абвешчаным паводле імяннога ўказа Сенату палажэнні аб акцызе з прыгатаванага тытуню [5; 10], які паслужыў базай для складалання, дапаўнення і ўдакладнення наступных нарматыўна-прававых актаў аб рэгуляванні тытунёвых акцызаў. У згаданым дакуменце абвяшчалася, што прыгатаваны тытунь расійскай вытворчасці ўсіх сартоў з замежнай і расійскай сыравіны як прадмет раскошы павінен абкладацца з 1839 г. памяркоўным акцызам, які спаганяўся ў форме бандэролі (праз наклейку ярлыкоў). Плацяжом акцызу абкладаўся нюхальны (табака) і курыльны тытунь расійскай вытворчасці. Разводзіць тытунь можна было без ніякіх абмежаванняў. Захоўваўся безакцызны свабодны рознічны продаж уласнага непрыгатаванага, няцёртага тытуню ў сырым, непадрыхтаваным, натуральным выглядзе

ПолесГУ

тытуневодцамі. Прывазны замежны тытунь, у тым ліку з Царства Польскага (у гэтай частцы Расійскай імперыі з фінансавай аўтаноміяй і асобнай сістэмай тытунёвага абкладання да 9(21).04.1860 г. захоўвалася тытунёвая манаполія з аддачай тытунёвых збораў у адкупное ўтрыманне), пасля аплаты пэўнай мытнай пошліны забяспечваўся і абклейваўся асобымі кантрольнымі бандэролямі на мытнях без асобнага акцызнага плацяжу, за выключэннем збору ў 10 кап. асігнацыямі ( 3 кап. серабром) за кожную на матэрыялы і работу. Рознакаляровыя бандэролі з пэўнымі адзнакамі прыгатаваліся ў Экспедыцыі дзяржаўных папер і рассылаліся з гербавай паперай у казённыя палаты і ўездныя казначэйствы. Фабрыканты самастойна на выбар мелі права наклейваць бандэролі на тытунёвыя вырабы 1-3 сартоў з абмежаваннем, каб на курыльны крышаны і нюхальны драны табак – бандэролі 2-га і 3-га сорту, на кароты і сігары – 2-га сорту з платай не менш 20 % з прадажнай цаны. Некаторыя гатункі тытунёвых вырабаў (нюхальнага (1 і 4) табака, курыльнага (1, 4, 5), у рулях і каротах (1) тытуню, сігар (1 і 3) маглі абкладацца ў вышэйшых гатунках менш, а ў ніжэйшых і больш вызначаных 20 % з кошту. У «дамашніх тытунёвых установах» павінны былі наклейвацца бандэролі толькі ніжэйшых 4 і 5-га гатункаў тытунёвых вырабаў. Тытунёвыя фабрыкі і дамашнія ўстановы дазвалялася адчыняць гільдзейскім купцам і гандлюючым сялянам з пасведчаннямі першых 3-х родаў толькі ў губернскіх і ўездных гарадах пад заклад будынкаў. Мяшчане і гандлюючыя сяляне з пасведчаннямі 4-га роду маглі ўтрымліваць установы, у якіх выпрацоўваліся толькі нізкасортныя (4 і 5) тытунёвыя вырабы без прымешак і з натуральнай расійскай сыравіны. З тытунёвых прадпрыемстваў маглі прадавацца толькі абандэроленыя тытунёвыя вырабы. Гандаль тытунёвымі вырабамі мог ажыццяўляцца ў спецыяльных тытунёвых крамах і крамках (у апошніх спачатку тытунёвых вырабаў 4-га і 5-га гатункаў). З тытунёвых фабрык дазвалялася прадаваць воптам не менш 10 фунтаў тытунёвых вырабаў, а ўласнікам мець адну пры фабрыке і дзве па-за яе межамі крамы для дробнага продажу ўласнай прадукцыі. Дамашнія тытунёвыя ўстановы мелі права адкрыць адну краму для продажу свайго тавару. Урадам дакладна рэгламентавалася вага, колькасць, упакоўка прыгатаваных да продажу ў абандэроленым выглядзе тытунёвых вырабаў: нюхальнага цёртага табака ў бляшанках і картузах (папяровых пакетах) ад 0,25 да 1 фунта, няцёртага ў рулях і каротах – ад 0,25 да 4 фунтаў, курыльнага ў пачках і картузах – ад 0,25 да 1 фунта, сігар у скрынках (па 100 і 250 штук) і пачках (па 10 і 25 штук). Умовай вырабу тытунёвай прадукцыі на фабрыках і дамашніх прадпрыемствах і продажу яго ў гандлёвых памяшканнях было штогоднае набыццё да 15 снежня пасведчання на наступны год (для фабрык на 25-рублёвым лісце крапаснай паперы, для крамы – 10-рублёвага, для тытунёвага дамашняга прадпрыемства – 3-рублёвага, крамкі – 1-рублёвага). Нагляд за прыгатаваннем і продажам тытунёвых вырабаў даручаўся паліцыі, асобным акцызным наглядчыкам (з 1843 г.) пры паліцыі ці піцейным водкупу з узнагародай адкупшчыкоў піцейных збораў кантрактнымі працэнтамі з сум, паступаючых за раздадзеныя з мясцовых уездных казначэйстваў бандэролі (8-10 % з сум, паступаючых у казну за праданыя банджэролі і пасведчанні), за кошт паловы ўсіх штрафаў і выручанай сумы пры публічным продажу канфіскаванага тытуню і рэчаў прадпрыемстваў. Уводзілася цэлая сістэма грашовых штрафаў за парушэнне ўмоваў палажэння: за падробку і перадачу ў іншыя рукі бандэролей, адкрыццё незаконных (без набыцця патэнта) тытунёвых прадпрыемстваў, ці тых, якія належылі асобам, якім прыгатаванне і продаж тытунёвых вырабаў быў забаронены, за падлог (падробку) пасведчання, адкрыццё прадпрыемства ў забароненым месцы, за адсутнасць у крамах і крамках шыльды і дзвярэй на вуліцу з інфармацый аб продажы тавару і інш.

Памер акцызнай стаўкі вагаўся ў залежнасці ад вызначаных 5 сортаў тытунёвых тавараў, якія выпрацоўваліся на тытунёвых фабрыках і дамашніх прадпрыемствах (толькі 4 і 5 гатункі). Іншымі словамі, памер акцызнага падаткаабкладання тытуню залежыў ад яго якасці.

| Від тытуневых вырабаў і кошт бандэролі з фунта | Тытунь з прыгатаваных лістоў, цёрты тытунь і табака, у каротах, рулях і папушах | | | Тытунь цёрты і пакрышаны з натуральных лістоў | Тытунь курыльны з лістоў, сцяблінкаў і карэньчыкаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1 сорт | 2 сорт | 3 сорт | 4 сорт | 5 сорт |
| Цёрты табака | 100 | 60 | 40 | 16 | |
| З руляў і каротаў для крышэння | 80 | 40 | | | |
| Пакрышаны тытунь для палення | 60 | 40 | 20 | 12 | 8 |
| Рулі і папушы для драблення | 50 | 30 | | | |
| 100 штук сігар | 160 | 80 | 40 | | |

*Табліца 1. Тарыфныя стаўкі акцызу з тытуню, кап. асігнацый з фунта [5, с. 218]*

Пасля увядзення сярэбранага монаметалізму ў выніку грашовай рэформы Я. Ф. Канкрына плацёж усіх збораў быў пераведзены на сярэбраную манету. За пасведчанне на тытунёвую фабрыку трэба было заплаціць 7,5 руб., за краму – 3 руб., за дамашнюю ўстанову – 90 кап., за крамку – 30 кап. [24].

Наступныя ўказы растлумачвалі, дапаўнялі і ўдакладнялі акцызнае палажэнне 1838 г. З канца 1838 г. гаспадары дамашніх тытунёвых устаноў маглі наклейваць бандэролі і першых трох гатункаў на цёрты ці крышаны вышэйшы адборны тытунь у сігарах, рулях і каротах з расійскай сыравіны. У 1842 г. быў дазволены раскурачны продаж тытуню ў тракцірных установах. З 1843 г. у губернскіх гарадах, дзе было шмат тытунёвых фабрык і дамашніх устаноў, з мэтай узмацнення дзяржаўнага нагляду за вытворчасцю і продажам тытунёвых вырабаў, быў вызначаны штат асобных акцызных наглядчыкаў і іх памочнікаў пры казённых палатах па меры неабходнасці і меркаванні міністра фінансаў (па 20 акцызных наглядчыкаў з жалаваннем усім 6 тыс. руб.) [18; 20]. У чэрвені 1843 г. для павелічэння акцызнага збору ад продажу бандэроляў было дазволена гандлюючым па пасведчанням 4-га роду мяшчанам на 4 гады вырабляць у дамашніх установах і прадаваць у крамках сігары з расійскага тытуню [17].

Пасля прыняцця палажэння 1838 г. высветлілася, што амаль 2/3 усіх тытунёвых вырабаў ухіляліся ад акцызнага падаткаабкладання, паколькі асноўная частка насельніцтва спажывала тытунь у выглядзе ліставога тытуню без фабрычнай пераапрацоўкі. Гэта было нявыгадна і для вытворцаў, і для казны.

18.02.1848 г. імператар зацвердзіў устаў аб акцызе з тытуню, які некалькі перагледаў, удасканальваў, дапаўняў правілы папярэдняга акцызнага палажэння 1838 г. [6]. У ім растлумачвалася, што ў лік прыгатаванага тытуню ўключаліся прыгатаваныя лісты і сцяблінкі, звернутыя ў рулі і кароты, тытунь цёрты, крышаны і ў сігарах, крошкі і цалкам замежны тытунь. Ва ўездах, якія не мелі тытунёвых плантацый, забаранялася дамашняе прыгатаванне тытуню для ўласнага спажывання. Продаж расійскага ліставога тытуню дазваляўся з крам і крамак паводле ўсталяваных пасведчанняў, а звернутага ў рулі і кароты – па бандэролям у залежнасці ад сорту. Прыгатаваны тытунь усіх сартоў з расійскай і прывазной замежнай сыравіны падлягаў плацяжу акцыза. Бандэролі павінны былі рассылацца Дэпартаментам розных падаткаў і збораў Міністэрства фінансаў разам з гербавай паперай у казенныя палаты, уездныя казначэйствы і па меры неабходнасці ў магістраты, думы і ратушы. Падрабязна распісваўся парадак развозу, рассылкі і разносу тытуневых вырабаў. Адбыліся змены кошту пасведчанняў па асобнай форме на гербавых лістах на права вырабу і гандлю тытунёвай прадукцыяй. Павялічвалася плата за пасведчанні на права адкрыцця тытунёвых устаноў і продажу тытунёвых вырабаў: на

ПолесГУ

тытунёвую фабрыку ці права воптавага продажу замежнага тытуню да 15 руб., на кожную краму і права рознічнага гандлю замежным тытунем – да 10 руб., на тытунёвую дамашнюю ўстанову – да 5 руб., за крамку – да 3 руб. Дакладна рэгламентаваліся правілы гандлю тытунёвымі вырабамі ў піцейных і забаўляльных установах. Права продажу для курэння на месцы курыльнага тытуню з бандэролямі для тракціраў, кафэ-рэстарантаў, гасцініц, рэстарацый, кававых дамоў, буфетаў пры клубах, тэатрах у губернскіх гарадах каштавала 15 руб., ва ўездных, заштатных гарадах і мястэчках – 5 руб., для корчмаў у губернскіх гарадах – 10 руб., ва ўездных, заштатных гарадах і мястэчках – 5 руб., права разносу 10 сігар на публічных відовішчах – 1 руб. Нагляд за вырабам і продажам тытунёвых вырабаў ускладаўся на паліцыю, асобных акцызных наглядчыкаў і іх памочнікаў пры казённых палатах, а ў выпадку іх адсутнасці – на чыноўнікаў казеннай палаты ў губернскіх гарадах, чыноўнікаў уездных казначэйстваў, камандзіруемых ад казеннай палаты па розным даручэнням ва ўезды. Зменьваўся тарыф акцызу з тытуню, збіраемага бандэролямі.

У цэлым, новы акцызны тытунёвы ўстаў 1848 г. скасоўваў безбандэрольны продаж тытуню 4-га і 5-га сартоў, уводзіў яшчэ адзін вышэйшы сорт для курыльнага тытуню і сігар, пашыраў правы фабрыкантаў на воптавы і дробны продаж тытуню, павялічваў тытунёвы акцыз на 25 %, забараняў прыгатаванне тытуню ў дамашніх умовах для сваіх патрэб усім, акрамя тытуневодаў. Прызначаныя ў Віленскай і Мінскай губернях акцызныя наглядчыкі казеннай палаты ( па 22 чал. з коштам утрымання ў 6600 руб.) павінны былі ўзмацніць нагляд за вытворчасцю і продажам тытунёвых вырабаў. Увядзенне ў дзеянне тытунёвага ўстава 1848 г. павінна было паменшыць падатковы цяжар для спажыўца і зменьшыць пашыраную граніцу для атрымання прыбытку фабрыкантамі і гандлярамі, выклікаць пашырэнне абаротаў продажу тытунёвых вырабаў і павелічэнне казенных паступленняў ад тытунёвага акцызу.

З 1855 г. уводзілася плата за бандэролі на тытунь і сігары па новаму тарыфу. Заснаванне новых дамашніх тытунёвых устаноў для прыгатавання тытунёвых вырабаў забаранялася, а адкрытыя маглі працягнуць сваю працу яшчэ на два гады, але з абавязковай умовай, каб іх гаспадары набывалі бандэролей у першы год дзейнасці на суму не менш 300 руб., у другі – не менш 400 руб. Пасля сканчэння 2-гадовага тэрміну яны павінны былі аплаціць пасведчанне для адкрыцця тытунёвай фабрыкі ці закрыць свае ўстановы. Уладальнікі тытунёвых фабрык былі абавязаны штогод з 1855 г. пакупаць бандэролі на суму не менш чым 500 руб. Плата за бандэролі на тытунь і сігары з 1.11.1855 г. павінна была спаганяцца з павелічэннем акцызнага працэнта агулам ад 20 да 25 % [19].

Канцэнтрацыя вытворчасці тытунёвых вырабаў на фабрыках нязначна павялічыла казенны акцызны даход з тытуню. Акцызны нагляд з боку піцейных адкупшчыкоў і чыноўнікаў казеннай палаты не меў фактычнай моцы і шмат тытунёвых вырабаў прадавалася без аплаты акцызу. Насельніцтва ў большасці спажывала больш безакцызнага тытуню нізкай якасці, чым падакцызных тытунёвых вырабаў. Так, сяляне палескіх вёсак курылі ў асноўным махорку [8, с. 82-83]. Цікавы разлік правялі чыноўнікі Міністэрства фінансаў. Паводле іх меркаванняў, з 1,5 млн. пудоў тытуню 15 % (225 тыс. пудоў) шло на безбандэрольнае спажыванне ва ўездах з тытунёвымі плантацыямі, 30 % (450 тыс. пудоў) прыпадала на незаконнае дамашняе прыгатаванне тытунёвых вырабаў з сырога (неапрацаванага) тытуню, гандаль якім быў свабодны, за мяжу, у Фінляндыю, Сібір і Закаўказзе вывозілася 14 % (211 тыс. пудоў), страты пры перавозкі складалі 5 % (75 тыс. пудоў). Заставалася 539 тыс. пудоў тытуню і з дадаткам прывезенага з-за мяжы 150 тыс. пудоў тытуню, павінна было быць да 690 тыс. пудоў падакцызнага тытуню. У сярэднім з 1851 па 1856 гг. у Расійскай імперыі штогод спажывалася па 293650 пудоў тытуню, а астатнія 396350 пудоў тытуню адпускаліся без бандэролей [9, с. 24]. У 1856–1866 гг. у Расійскай імперыі акцызам аплочвалася толькі да 23 % тытунёвых вырабаў (у 1856-1857 гг. спажывалася 1230 тыс., у 1858-1860 гг. – 1300 тыс., у 1861-1863 гг. – 1265 тыс., у 1864-1866 г. – 1617 тыс. пудоў тытуню) [21, с. 325]. У рэальнасці, паводле

некаторых даных, з 3 млн. пудоў расійскага тытуню не больш 200 тыс. пудоў тытуню (6,6 %) абкладаліся бандэролямі ці акцызнымі плацяжамі.

Акцызная тытунёвая сістэма заахвочвала вытворцаў павялічваць якасць прадукцыі (для вышэйшага і 1-га сорту чым больш была цана, тым больш было і працэнтнага акцызу ад яе кошту, для астатніх сартоў тытунёвых вырабаў урад вызначыў максімальны кошт і змяншэнне цаны не было ў інтарэсах фабрыканта, паколькі памяншаўся б і яго прыбытак). Чым быў лепей і больш каштаваў тытунёвы выраб, тым меншы падатковы цяжар быў у адносінах да вартасці спажываемага тытунёвага тавару. І наадварот, чым меней быў якасны тытунёвы тавар, тым больш спажывец выплочваў акцызу з адноснай вартасці тытуню без бандэролі.

На тэрыторыі Беларусі не існавала буйных тытунёвых прадпрыемстваў. Першая так званая тытунёвая фабрыка была зафіксіравана ў 1818 г. у Віцебску, у 20-я гг. XIX ст. было 8 фабрык, у тым ліку 6-ць у Мінскай губерні. Колькасць тытунёвых прадпрыемстваў павялічылася пасля таго, як з 1840-х гг. стала падвозіцца танная сыравіна па Дняпру ў асноўным з Чарнігаўскай губерні. У 40-я гг. XIX ст. тытунёвыя фабрыкі ствараюцца ў Гродне, Мінску і іншых гарадах. У 50-я гг. XIX ст. было 17 тытунёвых фабрык (па 4 у Брэсце і Пінску, па 2 – у Віцебску і Ваўкавыску, але ніводнай класічнай мануфактуры ці фабрыкі). У 1860 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 32 тытунёвыя фабрыкі (10 у Мінску, па 5 – у Брэсце і Пінску, 3 – у Гродне, 15 – у Гродзенскай губерні), якія выраблялі прадукцыі на 23,9 тыс. руб. (у тым ліку на 5,7 тыс. руб. у Пінску, на 5,6 тыс. руб. – у Брэсце, на 3,4 тыс. руб. – у Мінску, на 2,5 тыс. руб. – у Гродне, на 2,4 тыс. руб. – у Магілёве) [3, с. 118, 119, 120].
Вызначыць выпуск колькасці і кошту прадукцыі на тытунёвых фабрыках гарадоў губерняў Беларусі складана з прычыны беднасці і супярэчлівасці, несупастаўнасці статыстычных даных (гл. табл. 2).

| Месцазнаходжанне | Сума штогоднага вырабу тавараў, руб. |
|---|---|
| Гродна | 2380 руб. (1860 г.) |
| Мінск | 12 фабрык на 1628 руб. (1846 г.), 10 фабрык да 2 тыс. руб. (1850 г.), 3400 руб. (1860 г.) |
| Рэчыца | 3606 руб. (1845 г.) |
| Гродзенская губерня | 2 фабрыкі на 90 руб. (1843 г.), 4 фабрыкі на 3251 руб. (1857 г.) |
| Мінская губерня | 3 фабрыкі на 5100 руб. (1860 г.) |

*Табліца 2. Ацэнка дынамікі штогодных вырабаў прадукцыі на тытунёвых фабрыках Беларусі ў 40-50-я гг. XIX ст. [2, с. 100; 4, с. 38, 39; 8, с. 237; 3, с. 243, 248, 252]*

Тытунь разводзіўся ў Пінскім, Рэчыцкім, Слуцкім і Навагрудскім уездах Мінскай губерні. Вытворцы выручалі з кожнага пуда тытуню ад 2,4 да 4 руб. Некаторыя памешчыкі вырошчвалі амерыканскі віргінскі сорт тытуню, з якога рабілі танныя сігары [8, с. 83]. Па звестках старшыні Мінскай казённай палаты ад 27.04.1845 г. міністру фінансаў, у некаторых памешчыцкіх маёнтках Рэчыцкага, Мазырскага і Ігуменскага ўездаў збіралася, відаць, да тысячы пудоў тытуню. У Мінск штогод з Нежынскага і іншых уездаў Чарнігаўскай губерні дастаўлялі ад 40 да 50 тыс. пудоў тытуню ў лістах, з якога 1/3 частку прадавалі ў Мінскай губерні, а 2/3 паступалі для перапродажу ў Віленскую, Ковенскую і Курляндскую губерні [14, арк. 2–2 адв.].

31.01.1848 г. ад імя Дэпартамента выканаўчай паліцыі Міністэрства ўнутраных спраў міністр унутраных спраў накіраваў цыркулярнае прадпісанне віцебскаму грамадзянскаму губернатару. У дакуменце міністр фінансаў зазначыў, што ў некаторых губернях адбываўся значны продаж сігар без бандэролей, а прамыслоўцы, скупаючы пустыя, былыя ў выкарыстанні скрынкі, напаўнялі іх зноў тытунёвымі вырабамі для

продажу з разрэзанымі бандэролямі [15, арк. 1-2 адв., 5, 6]. Віцебская казённая палата для нагляду за тытунёвым акцызам прызначыла ў 11 уездных гарадах засядацелей земскіх судоў па карчомнай частцы і яшчэ бухгалтараў уездных казначэйстваў (у Віцебску на левым беразе Заходняй Дзвіны бухгалтара рэвізскага аддзялення казённай палаты Кладніцкага, на правым – сталаначальніка канцылярыі Краснадэмбскага, асэсары палаты Цэйтліх і Сяніцкі наглядалі асабова ў паселішчах) [15, арк. 54, 55, 72 адв.-73]. Па Віцебскай губерні акцызу з тытуню ад продажу бандэролей паступіла ў 1847 г. толькі 41,7 руб., у 1848 г. – не больш 9,2 руб. Яшчэ ў 1847 г. было выдана 7 пасведчанняў на тытунёвыя дамашнія ўстановы. Пакольківа мізэрнасць сумаў тытунёвых акцызаў вынікала толькі ад слабага нагляду за правільным прыгатаваннем і продажам тытуню, таму прадпісвалася ўзмацніць кантроль, каб не прадаваліся тытунёвыя вырабы без бандэролей [15, арк. 72]. За 1846–1853 гг. па 12 гарадам Віцебскай губерні паступіла 9080,85 руб. тытунёвых акцызных даходаў за пасведчанні і бандэролі (за 1846 г. 326,98 руб.), а таксама 969,74 руб. узнагародных грошай [16, арк. 344–344 адв.].

У Мінскай губерні ад продажу бандэролей у 1847 г. паступіла 359,51 руб., да 1.07.1848 г. – 372,08 руб., за 9 месяцаў 1849 г. – 517,83 руб. У 1847 г. было выдана 33 пасведчання на тытунёвыя дамашнія ўстановы. Малазначнасць акцызнага даходу тут таксама тлумачылі слабым наглядам за правільнай нарыхтоўкай і продажам тытуню. Па ўездным казначэйствам Мінскай губерні паступіла да 1.10.1848 г. 626,6 руб., да 1.10.1849 г. – 517,83 руб., за 9 месяцаў 1850 г. – 824,79 руб., менш 1849 г. на 172,04 руб. [14, арк.10, 19, 22–22 адв., 25].

Паводле 79 пункта тытунёвага акцызнага ўстава 1848 г. з грашовых спагнанняў за парушэнне яго правілаў і з сумаў, якія паступалі ад продажу канфіскаванага тытуню, палова сум выдавалася даносчыкам, а другая палова – залічвалася ў асобны капітал пры Дэпартаменце розных падаткаў і збораў для выдачы ўзнагарод чыноўнікам, якія кантралявалі тытунёвы акцыз. Акрамя таго, з даходу, які перавышаў збор ад продажу ў 1846 г. бандэролей і пасведчанняў, казённыя палаты адлічвалі штогод 15 % для выдачы па распараджэнні Міністэрства фінансаў у якасці ўзнагароды штатным і нештатным чынам, якія наглядалі за тытунёвымі акцызнымі зборамі [6, с. 127]. Вядома, што ў Мінскай губерні падобных узнагарод з 15 % сумы звыш акцызнага тытунёвага даходу было выдзелена ў 1848–1855, 1857–1859 гг. больш 2455,9 руб. [12; 13].

Дынаміку паступленняў акцызных тытунёвых збораў за 40-50-я гг. XIX ст. можна прагледзець па Мінскай губерні (гл. табл. 3, 4).

| **Год** | **За пасведчанні і бандэролі на тытунь** | **За пасведчанні за права продажу курыльнага тытуню і сігар у тракцірах** | **Разам акцызных збораў з тытуню** | **Разам сметных даходаў** | **% паказчык акцызных тытуневых збораў** |
|---|---|---|---|---|---|
| 1841 | 3800 | | 3800 | 1269512,12 | 0,3 |
| 1842 | 700 | | 700 | 1263834,82 | 0,05 |
| 1843 | 700 | | 700 | 1269782,16 | 0,05 |
| 1844 | 900 | | 900 | 1053900,35 | 0,08 |
| 1846 | 890 | 100 | 990 | 1246278,42 | 0,08 |
| 1847 | 1120 | 80 | 1200 | 1231356,92 | 0,1 |
| 1849 | 1000 | 100 | 1100 | 1264754,61 | 0,09 |
| 1850 | 2000 | 100 | 2100 | 1254507,12 | 0,17 |
| 1851 | 2000 | 150 | 2150 | 1803479,03 | 0,12 |
| 1853 | 1850 | 150 | 2000 | 1653191,04 | 0,12 |
| 1854 | 2000 | 150 | 2150 | 1712272,95 | 0,12 |
| 1855 | 2000 | 150 | 2150 | 1551116,1 | 0,14 |
| 1856 | 1700 | 100 | 1800 | 1491395,74 | 0,12 |
| 1857 | 2700 | | 2700 | 1631603,34 | 0,16 |
| 1858 | 3750 | 50 | 3800 | 1666705,21 | 0,23 |
| 1859 | 4400 | | 4400 | 1985094,15 | 0,22 |
| 1860 | 4200 | 50 | 4250 | 1988486,25 | 0,21 |

ПолесГУ

*Табліца 3. Сметныя зборы акцызу з тытуню ў Мінскай губерні, руб. [11]*

| **Найменне збору** | **1857** | **1858** | **1859** | **1860** | **Разам** |
|---|---|---|---|---|---|
| **За пасведчанні на нарыхтоўку і продаж тытуню і за бандэролі на тытунь усіх сортаў** | 5068 | 3229 | 2374 | 2404 | 13075 |
| **Разам неакладных збораў** | 252508 | 265056 | 249610 | 254082 | 1021256 |
| **Адносны паказчык, %** | 2 | 1,2 | 0,95 | 0,9 | 1,3 |

*Табліца 1. Паступленні акцызу з тытуню па Мінскай губерні ў 1857–1860 гг., руб. [8, с. 574]*

З прыведзенага вынікае, што тытунёвыя акцызныя паступленні, нягледзячы на відавочную розніцу іх планавання і рэальнага збору, не ігралі істотнай ролі ні ў даходнай частцы (у сярэднім 0,14 %), ні ў структуры неакладных збораў (у сярэднім 1,3 %) бюджэта Мінскай губерні.

Памеры паступленняў некаторых тытунёвых акцызных збораў па ўсім губерням Беларусі маюцца з канца 1850-х гг. (гл. табл. 5).

| Год | Віленская | | Віцебская | | Гродзенская | | Мінская | | Магілёўская | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Колькасць | Руб | Колькасць | Руб. | Колькасць | Руб. | Колькасць | Руб. | Колькасць | Руб. |
| 1858 | 2 | 726 | 3 | 1002 | 5 | 2458 | 8 | 2120 | 1 | 500 |
| 1859 | 1 | 499 | 2 | 1008 | 5 | 2099 | 3 | 1073 | 2 | 590 |
| 1860 | 1 | 567 | 6 | 1384 | 5 | 2584 | 3 | 1418 | | |

*Табліца 2. Колькасць тытунёвых фабрык і выбраных імі бандэроляў на суму, руб. [7, отд. 3, с. 61; 22, с. 330-331]*

У цэлым, у гарадах губерняў Беларусі паступленні за абандэроленыя тытунёвыя вырабы былі мізэрнымі ў агульнаімперскім маштабе (для прыкладу: з Пецярбургскай збіралася бандэролей на 990-1252 тыс. руб., з Маскоўскай – на 430-630 тыс. руб.).

Такім чынам, сінтэз элементаў акцызнай і манапольнай сістэм ускоснага падаткаабкладання абумовіў з’яўленне арыгінальнай змешанай акцызна-бандэрольнай сістэмы спагнання тытунёвага збору. Дзяржаўны даход з тытуню ўключаў: 1) акцыз з прыгатаванага прывазнога замежнага і расійскага тытуню усіх гатункаў і відаў (на вырабы наклейвалася так званая бандэроль, накшталт квітанцыі ці распіскі ў атрыманні патрэбнай сумы дзяржаўнай касай); 2) платы за пасведчанне (патэнт) на права прыгатавання і гандлю тытунёвымі вырабамі; 3) мытнай пошліны з прывазнога замежнага тытуню. Акцыз з расійскага тытуню спаганяўся шляхам бандэролей, якія наклейваліся самімі фабрыкантамі і купляліся за наяўныя грошы ва ўездных казначэйствах па вызначаным у асобнай табелі розным цэнам, адпаведна вагі і кошту тытуня розных гатункаў. Прадажная цана тытунёвых вырабаў з уключэннем кошту бандэролі, у асноўным, павінна была адпавядаць рэгулюемаму ўрадам кошту з умовай, каб бандэрольны акцыз складаў не менш 20 % прадажнай цаны. Месцы вытворчасці і продажу тытунёвых вырабаў абкладаліся патэнтным зборам. Фіскальнае значэнне тытунёвага акцызу, які існаваў у форме платы за бандэролі, якія наклейвалі на ўпакоўкі з гатовай прадукцыяй і якія вытворцы набывалі ў казначэйствах на пэўную суму па асобнаму тарыфу ў адпаведнасці з тыпам і сортам тытунёвых вырабаў, было мізэрным, паколькі тытунёвы збор збіраўся з нязначнай часткі ўсяго спажываемага насельніцтвам

ПолесГУ

тытуню. Акцызнае падаткаабкладанне прыгатаваных і прызначаных для продажу тытунёвых вырабаў сутыкалася з значнымі аб’ектыўнымі цяжкасцямі, звязанымі з малалікасцю чыноўнікаў адміністрацыі, якія маглі б ажыццяўляць рэгулярны кантроль за вытворчасцю і гандлем тытунем. Большасць падакцызнага тытунёвага тавару, асабліва ніжэйшых гатункаў, абарачалася без выплаты бандэрольнага збору.


1. Блиох, И. С. Финансы России XIX столетия. История-статистика: в 4 т. / И. С. Блиох. – СПб. : Тип. Тов-ва «Общественная польза», 1882. – Т. 3. – XIII, 232 с.
2. Бобровский, П. О. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния / П. О. Бобровский. – СПб. : Типография департамента Генерального штаба, 1863. – Ч. 2. Приложения. – VI, 391, 72 с., 13 л. табл.
3. Болбас, М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.) / М. Ф. Болбас. – Минск : Наука и техника, 1966. – 268 с.
4. Военно-статистическое обозрение Российской империи, издаваемое при 1-м отделении департамента Генерального штаба: в 17 т. – СПБ. : Тип. Департамента Генерального штаба, 1848–1858. – Т. 9. Ч. 4. Минская губерния / сост. поручик Стренг. – 1848. – 60 с., 3 табл.
5. Высочайше утверждённое 31.03.1838 г. положение об акцизе с приготовленного табаку // Полное собрание законов Российской империи: собрание 2-е с 1825 по 1881 г. : в 55 т. – СПб. : Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830–1862. (далей – ПСЗ-2.). – Т. 13-1. – № 11108. – С. 216–224. 59 п.
6. Высочайше утверждённый устав 18.02.1848 г. об акцизе с табаку // ПСЗ-2. – Т. 23-1. – № 22007. – С. 118–129. 93 п.
7. Ежегодник Министерства финансов / ред. А. Б. Бушен. – СПб. : Тип. Майкова, 1869. – Вып. 1. – III, V, 46, 209, 363 с.
8. Зеленский, И. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Минская губерния / И. Зеленский. – СПб. : Военная тип., 1864. Ч. 2. – VIII, IV, V, 701 с., 17 табл., карта.
9. Кауфман, И. И. Канкриновская система табачного обложения в России. Актовая речь И. И. Кауфмана / И. И. Кауфман. – СПб. : Тип. Б. М. Вольфа, 1912. – [4], 118 с.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) г. Мінск. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 974. Арк. 138-144.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) г. Мінск. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 749-751, 770, 3322-3326, 3330-3333, 3327-3329, 3334.
12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) г. Мінск. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 757. Арк. 39. Спр. 758. Арк. 70. Спр. 759. Арк. 83. Спр. 760. Арк. 57.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) г. Мінск. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 765-8. Арк. 35. Спр. 765-9. Арк. 53. Спр. 765-10. Арк. 40.
14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) г. Мінск. – Ф. 333. Воп. 25. Спр. 112.
15. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) г. Мінск. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 15076.
16. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) г. Мінск. – Ф. 2640. Воп. 1. Спр. 136.
17. О дозволении в домашних заведениях приготовлять сигары и продавать их собственно в табачных лавочках: высочайше утверждённое 1.06.1843 г. положение Комитета министров, распубликованное 26.06.1843 г. // ПСЗ-2. – Т. 18-1. – № 16910. – С. 371.
18. О надзоре за приготовлением и продажею табаку с 1843 г.: сенатский указ 23.09.1842 г. // ПСЗ-2. – Т. 17-1. – № 16041. – С. 911–913.
19. О порядке закрытия домашних табачных заведений и о тарифе бандеролей по табачному акцизу и продажных цен табака и сигар: высочайше утверждённое 17.11.1854 г. мнение Государственного Совета, распубликованное 7.12.1854 г. // ПСЗ-2. – Т. 29-2. – № 28745. – С. 26.
20. О учреждении надзора со стороны казны за правильною продажей и приготовлением табаку: высочайше утвержденное 23.06.1842 г. положение Комитета министров, распубликованное 27.07.1842 г. // ПСЗ-2. – Т. 17-1. – № 15778. – С. 685; Т. 17-2. К № 15778. – С. 116.
21. Першке, Л. Л. Акцизно-бандерольная система табачного налога в России и в Соединенных Штатах Северной Америки / Л. Л. Першке. – Рига : Типо-литогр. и словолитня Э. Платеса, 1890. – Х, 439 с.


ПолесГУ

22. Сборник сведений и материалов по ведомству Министерства финансов. – СПб. : Тип. В. Н. Майкова, 1865. – Т. 1. – 560, 174, IV с.
23. Семашко, И. Записки Иосифа, митрополита Литовского, изданные Императорской Академией наук по завещанию автора: в 3 т. – СПб. : Тип. Императорской Академии наук, 1883. – Т.2. – [3], 786 с.
24. Табели цен // ПСЗ-2. Т. 14-2. С. 240, 260.
ПолесГУ